Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 САКАВІКА 2014 г. СУБОТА № 58 (27668) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Клічуць стадыёны на футбол

СТАР. 6

«Песняры» і іх клоны

СТАР. 8

Якога колеру Айчына?

СТАР. 9

■ Вынікі выбараў

КАМУ ЛЮДЗІ ДАВЯРАЮЦЬ

Саветы абнавіліся менш чым напалову

Усе 1328 мясцовых Саветаў дэпутатаў Беларусі сфарміраваны ў правамоцным складзе. Пра гэта ўчора на пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў паведаміў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў ЛІЧБАХ

У выніку выбараў у Беларусі сфарміравана 6 абласных і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў, 118 раённых, 10 гарадскіх Саветаў у гарадах абласнога падпарадкавання, 14 гарсаветаў у гарадах раённага падпарадкавання, 25 пасялковых і 1154 сельскія Саветы, паведамляе БЕЛТА. «Усе Саветы сфарміраваны ў правамоцным складзе, і, у адпаведнасці з заканадаўствам, на працягу месяца павінны правесці арганізацыйныя сесіі, гэта значыць, прыступіць да выканання сваіх абавязкаў», — сказаў сакратар ЦВК.

У чатырох выбарчых округах выбары не праводзіліся, у трох округах балатавалася па адным кандыдаце, якія не набралі неабходнай колькасці галасоў. Выбарчых округ, у якіх выбары прызнаны несапраўднымі, няма.

БОЛЬШ УСВЯДОМЛЕНЫ ЎДЗЕЛ

Старшыні абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій далі справаздачу перад кіраўніцтвам ЦВК пра тое, як кампанія прайшла ў рэгіёнах і сталіцы. Істотных парушэнняў зафіксавана не было, выбары прайшлі арганізавана, у дэмакратычнай і дзелавой абстаноўцы, адзначалася падчас пасяджэння.

Высокую адзнаку старшыні абласных камісій далі зменам і дапаўненням у выбарчым заканадаўстве. Так, участковыя камісіі ўпершыню разам з запрашэннем наведаць выбаршчыкам інфармацыйныя матэрыялы пра кандыдатаў у дэпутаты. Гэта дапамагло павялічыць яўку выбаршчыкаў, паколькі яны маглі загадзя скласці думку пра кандыдатаў, якія балатуюцца па іх округах, і зрабіць усвядомлены выбар.

Са Br100 млрд, вылучаных на правядзенне мясцовых выбараў, было сэканомлена Br22 млрд.

АМАЛЬ ТРАЦІНА КАНДЫДАТАЎ-ПАРТЫЙЦАЎ АТРЫМАЕ МАНДАТ

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына нагадала, што сярод зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты прадстаўнікоў партый было 748. З іх абрана 248 чалавек, ці каля 30%, і гэта нядрэнны паказчык, лічыць кіраўнік ЦВК.

«Прынамсі, з зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты больш за 3% былі партыйцы. Думаю, сярод выбаршчыкаў членаў партый не больш. Гэта значыць, як яны сацыяльна прадстаўлены ў грамадстве, так яны былі прадстаўлены і ў выбарчай кампаніі», — сказала старшыня Цэнтрвыбаркама.

Кіраўніца ЦВК звярнула ўвагу, што ўласна партыйнага вылучэння на мясцовых выбарах было мала. Шмат якія партыйцы вылучаліся шляхам збору подпісаў.

З 18 тысяч 809 дэпутатаў мясцовых Саветаў толькі 1,3% — прадстаўнікі палітычных партый.

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ УКАМПЛЕКТАВАНА

Цэнтральная камісія Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў таксама падвяла вынікі паўторных выбараў дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання ў Гомельска-Навабеліцкай выбарчай акрузе № 36 і зарэгістравала дэпутатам па гэтай выбарчай акрузе Алену Астапюк.

Яна набрала больш за 76% галасоў выбаршчыкаў. Выбары дэпутата парламента праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. У бюлетэні для галасавання былі прозвішчы яшчэ двух кандыдатаў: Мікалая Шкірэева, які набраў у выніку каля 8% галасоў, і Віктара Хоміча, яго вынік — каля 7%.

НАСТУПНЫЯ ВЫБАРЫ — ПРЭЗІДЭНЦКІЯ

«Выбары павінны праходзіць не пазней, чым за два месяцы да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў, гэта значыць, не пазней за 20 лістапада 2015 года», — удакладніла старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына.

Прэзідэнцкая выбарчая кампанія доўжыцца тры месяцы. «Калі мы гаворым пра 20 лістапада, то, такім чынам, не пазней 20 жніўня выбары павінны быць прызначаны», — сказала кіраўніца ЦВК.

Лідзія Ярмошына паведаміла, што зменіцца ў прэзідэнцкай выбарчай кампаніі з улікам прынятых паправак у выбарчае заканадаўства. Асабістыя выбарчыя фонды прэтэндэнтаў на пост прэзідэнта дазволена ствараць яшчэ да таго, як яны афіцыйна стануць кандыдатамі, гэта значыць, ужо з рэгістрацыі ініцыятыўных груп. З гэтага моманту ўдзельнікі перадвыбарнай гонкі змогуць аплачваць выдаткі. Павялічаны і памер асабістых выбарчых фондаў кандыдатаў у прэзідэнты — з 3 да 9 тысяч базавых велічынь (адна БВ пакуль складае Br130 тыс.)

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу **2 красавіка 2014 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 красавіка 2014 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

СОНЕЧНАЕ НАТХНЕННЕ

г. Мінск.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

Br7 млн 233 тысячы

склала сярэдняя заработная плата ў Мінску ў лютым гэтага года. Гэта на 1 млн 844 тысячы вышэй, чым сярэдняя зарплата па рэспубліцы. У студзені-лютым 2014 года намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Мінска склала Br7191,5 тыс., у тым ліку ў лютым — Br7233 тыс., і павялічылася ў параўнанні са студзенем 2014 года на 0,9%. Рэальная заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі, у студзені-лютым 2014 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2013-га павялічылася на 7,4%, у лютым 2014-га ў параўнанні са студзенем — паменшылася на 1,1%. Найбольш высокааплатнымі ў сталіцы ў лютым былі работнікі арганізацый, звязаных з вылічальнай тэхнікай і фінансавай дзейнасцю. Сярэдняя заработная плата работнікаў у гэтых арганізацыях склала адпаведна Br15512,5 тыс. і Br12346 тыс.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2014 г.

Долар ЗША	9870,00	▲
Еўра	13570,00	▼
Рас. руб.	277,00	■
Укр. грыўня	881,25	▼

■ Напярэдадні чэмпіянату

ТРАНСПАРТНІКІ ГАТОВЫЯ. ПАЕХАЛІ!

У Міністэрстве транспарту і камунікацый на пасяджэнні падкамітэта па пытаннях дарожнага будаўніцтва і транспартнага забеспячэння арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні сёлета чэмпіянату свету па хакеі былі разгледжаны пытанні работы транспарту падчас вышэйназванага мерапрыемства.

НА МАРШРУТЫ — ДАДАТКОВЫЯ АЎТОБУСЫ

У адпаведнасці з Планам дзеянняў Мінскага гарвыканкама па забеспячэнні транспартнага абслугоўвання ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі прадугледжана закупка 150 аўтобусаў. Летась набылі 114 аўтобусаў і 10 тралейбусаў. У красавіку МАЗ паставіць яшчэ 36 аўтобусаў для выканання гарадскіх перавозак; 20 аўтобусаў «МАЗ-251» для абслугоўвання камандаў-удзельніц чэмпіянату; 10 аўтобусаў «МАЗ-107» павышанай камфортнасці для перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах у Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Акрамя таго, для транспартнага забеспячэння ў перыяд правядзення чэмпіянату ААТ «Гомельаблаўтатранс» пастаўлены 3 аўтобусы «МАЗ-251» і ў красавіку будуць пастаўлены яшчэ 7 такіх аўтобусаў.

Мінгарвыканкам зацвердзіў 11 мэтавых маршрутаў пасажырскага транспарту падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі: «АВ «Цэнтральны» — «Мінск-Арэна»; «АВ «Цэнтральны» — Студэнцкая вёска»; «АВ «Цэнтральны» — «Чыжоўка-Арэна»; «Мінск-Арэна» — «Чыжоўка-Арэна»; «Студэнцкая вёска — Нацыянальны аэрапорт «Мінск»; «Студэнцкая вёска — «Мінск-Арэна»; «Студэнцкая вёска — «Чыжоўка-Арэна»; «Ст. м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна»; «П.п. «Лошыца» — «Чыжоўка-Арэна»; «Ст. м. «Няміга» — «Мінск-Арэна»; «Ст.м. «Пушкінская» — «Мінск-Арэна».

Арганізавана работа аўтобусаў па маршруце № 300Э «Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск» з прывязкай іх адпраўлення да раскладу руху паветраных суднаў. У перыяд правядзення чэмпіянату свету інтэрвал руху аўтобусаў у Нацыянальны аэрапорт Мінск складзе не больш за 30 хвілін, у пікавы час — не больш за 15 хвілін.

У сталічным метрапалітэне на ўсіх 25 станцыях праведзена ўладкаванне абмежавальных шуц-ліній па краях платформ. Перааформлены касавыя вокны і схемы ліній метрапалітэна, размешчана дадатковая інфармацыя на англійскай мове.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫГУНКА ВІТАЕ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ

На чыгуначных вакзалах станцый «Мінск-Пасажырскі» і «Брэст-Цэнтральны» з 7 па 25 мая будуць кругласутачна працаваць каардынацыйныя цэнтры для вырашэння пытанняў, звязаных з сустрэчай-провадамі ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату, якія будуць прыбываць (выбываць) чыгуначным транспартам. Акрамя існуючых міжнародных кас выдзелены дадатковыя спецыялізаваныя касы для продажу білетаў замежным грамадзянам.

СТАР. 2

■ Курсавая розніца

КЛІН КЛІНА ВЫБІВАЕ

Нездарма так кажуць у народзе. Абвастрэнне адносін Расіі з Захадам паказала трапнасць і натуральнасць гэтага сцвярджэння — расійскі рубель пасля санкцый пачаў расці.

Мы ўжо пісалі аб тым, што ў многім на гэты рост паўплываў абавязак па выплаце падаткаў у нацыянальнай валюце прадпрыемствамі. Аднак палітычная сітуацыя адыграла сваю ролю. Расійская эканоміка, якая апошнім часам, мякка кажучы, паказвала не лепшыя вынікі, атрымала дадатковы шанц на выжыванне. Па-першае, згуляе на карысць Расіі павышэнне кошту на нафту, справакаванае чаканнямі дэфіцыту гэтай сыравіны. Справа ў тым, што, скажам, Злучаныя Штаты могуць сабе дазволіць адмовіцца ад расійскай нафты, а для Еўропы гэта будзе балючым крокам. Па-другое, рускія бізнесмены, якія маюць вялікія капіталы, на хвалі патрыятызму ўкладваюць грошы на сваёй тэрыторыі. А па-трэцяе (і гэта самае цікавае), самі санкцыі супраць Расіі сталі нікому не патрэбнымі. Гэта вынікае з нядаўняй заявы нямецкага канцлера Ангелы Меркель: «Захад не дасягнуў ступені, якая прадугледжвае ўвядзенне эканамічных санкцый». Канцлер лічыць, што ўкраінскі крызіс павінен быць ліквідаваны дыпламатычным шляхам.

Наша нацыянальная валюта, на жаль, не можа пахваліцца павышэннем. Долар падаражэў на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9870. Еўра на пачатку тыдня значна вырасла, а пасля стала зніжацца. У выніку — падаражэнне на 20 рублёў (плюс 0,1%) да 13570. Расійскі рубель адыграў адразу 6,5 грашовай адзінкі (плюс 2,4%) да 277.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯНУКОВІЧ ЗАКЛІКАЎ ЗАМЕСТ ВЫБАРАЎ ПРАВЕСЦІ РЭФЕРЭНДУМ АБ ВЫЗНАЧЭННІ СТАТУСУ КОЖНАГА РЭГІЁНА УКРАІНЫ

Віктар Януковіч у чарговым сваім звароце заклікаў замест выбараў правесці рэферэндум аб вызначэнні статусу кожнага рэгіёна Украіны. «Як прэзідэнт, які з вамі думкамі і душой, заклікаю кожнага разважлівага грамадзяніна Украіны — не дайце самазванцам вас выкарыстоўваць. Патрабуйце правядзення рэферэндуму аб вызначэнні статусу кожнага рэгіёна ў складзе Украіны», — сказаў Віктар Януковіч. На яго думку, унесеныя ў заканадаўства Украіны змены, у тым ліку аб выбарах прэзідэнта Украіны, «выключаюць магчымасць сумленных выбараў, калі б яны ні адбыліся». Віктар Януковіч таксама папрасіў Партыю рэгіёнаў Украіны выключыць яго з гэтай партыі.

«НЕ Ў ГРОШАХ ШЧАСЦЕ», ВЫСВЕТЛІЛІ БРЫТАНСКІЯ САЦЫЁЛАГІ

Брытанскія і амерыканскія сацыёлагі апублікавалі вынікі даследаванняў, што паказваюць, прадстаўнікі якіх прафесій больш за ўсё задаволены сваёй працай. Вынікі аналітыкаў са Злучанага Каралеўства і Штатаў разышліся, але паказальным стала тое, што ўзровень заработнай платы не заўсёды вызначаў узровень «шчасця» і задаволенасці работніка. Сацыёлагі прыйшлі да высновы, што больш высокі ўзровень заработнай платы не рабіў іх рэспандэнтаў больш шчаслівымі — куды важнейшым аказалася ўсведамленне чалавека, што ён сваёй працай прыносіць карысць грамадству. Мае значэнне, зразумела, таксама асабістая схільнасць да той ці іншай працы. Напрыклад, святары з прыбыткам 34 тысячы долараў за год і фермеры, якія зараблялі каля 40 тысяч, аказаліся нашмат больш шчаслівымі за інжынераў, гадавы даход якіх — 64,7 тысячы долараў. Як высветлілі сацыёлагі, найбольш задаволены сваёй працай прадстаўнікі духавенства. За імі ішлі топ-менеджары і высокапастаўленыя чыноўнікі, менеджары і ўладальнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, спецыялісты па кіраванні якасцю і тэхнічным рэгуляванні, менеджары ў сферы аховы здароўя, урачы-практыкі, фермеры, уладальнікі гасцініц. У топ-10 трапілі таксама электрыкі і майстры па метале. А вось самымі няшчаснымі сябе адчувалі ўладальнікі бараў і супрацоўнікі месцаў, дзе дазволены продаж алкаголю.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

МАСКВА ВЫРАШЫЛА АДМЯНІЦЬ ПАГАДНЕННІ З КІЕВАМ ПА ЧАРНАМОРСКІМ ФЛОЦЕ

Прэзідэнт Расіі 27 сакавіка ўнёс у Дзярждуму прапанову аб спыненні дзеяння шэрагу дагавораў з Украінай, у тым ліку пагадненняў аб Чарнаморскім флоце. Пра гэта паведамляецца на сайце Крамля. Раней спыніць дзеянне гэтых дамоўленасцяў аб ЧФ прапанаваў Савет бяспекі Расіі. Гаворка ідзе аб падпісаных у 1997 годзе пагадненнях аб падзеле Чарнаморскага флоту, аб статусе і ўмовах знаходжання флоту на тэрыторыі Украіны, аб узаемаразліках, звязаных з падзелам ЧФ і знаходжаннем флоту на ўкраінскай тэрыторыі, а таксама аб пагадненні па пытаннях знаходжання ЧФ, падпісанага ў Харкаве ў 2010 годзе.

Як гаворыцца ў тлумачальнай запісцы, прадмет гэтых пагадненняў страчаны з прычыны таго, што Крым прынялі ў склад Расіі.

КОРАТКА

МЗС Беларусі атрымала па дыпламатычных каналах інфармацыю аб тым, што з 11 красавіка г.г. у Турэцкай Рэспубліцы ўводзяцца новыя правілы ўезду ў краіну. Візы для турыстычных або дзелавых паездак будуць выдавацца праз новую электронную сістэму.

У Беларусі зацверджаны правілы атэстацыі арганізацый і спецыялістаў у галіне будаўніцтва. Пастановай зацверджана палажэнне аб атэстацыі кіраўнікоў, спецыялістаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць у архітэктурнай, горадабудаўнічай, будаўнічай галіне, выконваюць работы па абследаванні будынкаў і збудаванняў.

ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» забяспечыла ў 2013 годзе максімальны аб'ём транзіту прыроднага газу за апошнія пяць гадоў у памеры 48,8 млрд куб. м і дасягнула гістарычнага максімуму транзіту па газаправодзе Ямал-Еўропа — 34,7 млрд куб.м.

Кошт будаўніцтва мемарыяльнага комплексу ў Трасцянцы складзе каля 10 млн еўра. Кошт першай чаргі будаўніцтва мемарыяла, якая, магчыма, пачнецца ўжо ў красавіку гэтага года, складзе 5 млн еўра. На добраўпарадкаванне тэрыторыі Трасцянца ў 2014 годзе Мінгарвыканкамам выдаткавана каля 200 тыс. еўра.

■ Балючая тэма

«ВІНАВАТЫ ТОЛЬКІ Я»...

Гэтыя словы ў пасмяротных запісках непаўналетніх самазабойцаў сустракаюцца часцей за ўсё

Зусім свежы прыклад. Малады чалавек збіраўся выкінуцца з акна інтэрната ў Бялынічах. Але гэта своечасова ўбачылі прахожыя і паспелі патэлефанаваць выратавальнікам. Цяпер хлопец знаходзіцца на лячэнні. А колькі прыкладаў, калі чалавек выносіць сабе смяротны прысуд і даводзіць яго да канца... Паводле статыстыкі, штодня больш за 1000 маладых людзей у свеце спрабуюць здзейсніць суіцыд, і ў аднаго са 100 гэта атрымліваецца. Сацыёлагі кажуць, што на працягу апошняга дзесяцігоддзя колькасць суіцыдаў сярод моладзі ўзрасла амаль у 3 разы. Толькі на Магілёўшчыне з пачатку гэтага года скончылі жыццё самагубствам 2 падлеткі.

За краем

У лютым у Чэрыкаве пахавалі 16-гадовага юнака. Яго знайшлі павешаным на гарышчы дома, дзе ён жыў. Здарылася гэта пасля таго, як ён пасварыўся са сваёй сяброўкай, ляпнуў дзвярыма і кудысьці пабег. А праз паўгадзіны стала вядома, што здарылася непапраўнае. Нельга казаць, што менавіта сварка стала прычынай яго зыходу з жыцця. Ён нават не выказваў такіх думак. Але дзесьці нешта пайшло не так, і гэта непрыемная для яго размова, магчыма, стала апошняй кропляй.

Маладосць і смерць — несумяшчальныя паняцці. І калі яны стаяць побач, здаецца, што гэта нейкая недарэчнасць, якую трэба выправіць. Але такое магчыма толькі ў казках. Ці ведаюць аб гэтым тыя, хто накідвае пятлю сабе на шыю ці саскоквае з даху? Здаецца, ведаюць. Але чамусьці ўсё роўна робяць гэты фатальны крок.

Дарэчы, па словах магілёўскіх праваахоўнікаў, на працягу года з жыцця сыходзяць каля 7-8 непаўналетніх жыхароў вобласці.

СТАР. 14